# Знаўцы права

**Днямі ў Беларускім дзяржаўным універсітэце былі падведзены вынікі беларускай студэнцкай юрыдычнай алімпіяды, арганізатарамі якой выступілі юрыдычны факультэт БДУ і Міністэрства адукацыі.**



Юрыдычная алімпіяда — гэта мерапрыемства, якое накіравана на стымуляванне навукова-даследчай работы студэнтаў, удасканаленне сістэмы беларускай юрыдычнай адукацыі і навукі, а таксама на развіццё традыцый прафесійных маладзёжных юрыдычных конкурсаў.

Сёлета ў спаборніцтве прынялі ўдзел 12 каманд і 40 студэнтаў з БДУ, Акадэміі МУС, Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і інш. На працягу трох дзён будучыя юрысты выконвалі заданні, накіраваныя на праверку ведаў у розных кірунках, што тычацца іх будучай прафесіі.

Як паведамілі ў прэс-службе БДУ, студэнты вядучай ВНУ краіны заваявалі на алімпіядзе шэсць узнагарод, якія былі разыграны сярод удзельнікаў індывідуальнага і каманднага залікаў.

Так, у індывідуальным выступленні дыпламантам I ступені стала прадстаўніца Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта Валерыя Грыневіч. А дыпламантамі II ступені сталі студэнты 3 курса юрыдычнага факультэта БДУ Паліна Філіпцова і Антон Мазоль. 3-е месца падзялілі паміж сабой студэнты юрыдычнага факультэта БДУ Стэфанія Стаўбунова (2 курс), Мікіта Грыцэвіч (3 курс) і прадстаўнік Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф.Скарыны Уладзіслаў Антоненка.

Званні "Лепшы абвінаваўца" і "Лепшы абаронца" сёлета атрымалі студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны Віктар Маісеенка і Лізавета Цянюта адпаведна.

Што тычыцца камандных спаборніцтваў, то лепшай прызнана каманда юрыдычнага факультэта БДУ "Тандэм". На 2-м месцы размясціліся каманды юрыстаў БДУ "Авангард Феміды" і Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф.Скарыны Lynces Justae. "Бронзу" ў гэтым туры падзялілі зборныя "Юстим" Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, "Купалаўцы" Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы і Alter ego Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Іван Аземша, студэнт 4 курса юрыдычнага факультэта БДУ, другі год запар у складзе "Тандэма" прымае ўдзел у камандных спаборніцтвах.

"Дзякуючы таму, што ў мінулым годзе ўжо прымаў удзел у алімпіядзе, сёлета падчас спаборніцтваў адчуваў сябе больш спакойна і ўпэўнена, — дзеліцца ўражаннямі І.Аземша. — Наша каманда старалася максімальна падрыхтавацца. Мы дадаткова вывучалі пытанні крымінальнага права, натарыяту, грамадзянскага права і інш. Дарэчы, наш "Тандэм" другі год запар становіцца лепшым у камандным заліку. Безумоўна, гэта дзякуючы таму, што ўдзельнікі каманды выдатна арыентуюцца ў шматлікіх нюансах юрыспрудэнцыі. Што тычыцца асабіста мяне, то я цікаўлюся публічным правам і яго галінамі: крымінальнае права, крымінальны працэс, пытанні міжнароднага права. Упэўнены, што алімпіяда — гэта цудоўная магчымасць прадэманстраваць свае веды. Яна дае штуршок да вывучэння тых кірункаў, што цікавяць студэнтаў. Акрамя таго, алімпіяда дае дакладнае ўяўленне аб тым, як прымяняць атрыманыя веды на практыцы. Для нас, будучых спецыялістаў, гэта вельмі важна".

**Наталля САХНО.**
*natallia.sakhno@nastgaz.by*